Уладзімер Арлоў



...штораз з большаю асалодай згадваю,
як усё тое, што будзе апошнім,
здарылася ўпершыню...

# Аўтографы самому сабе

## НА ГОТЛАНДЗЕ МНЕ СЬНІЦЦА ВОСТРАЎ ПОЛАЦК

На Готландзе мне сьніцца востраў Полацк.
Пакінуўшы Айчыны мацярык,
плыве ён у нясьпешлівым Гальфстрыме
маіх гадоў, падзеленых з самотай.

То з вышыні крыла з падбоем сінім,
то асядлаўшы калывасты плот,
гляджу на дом і сад стары зьдзічэлы,
куды зайцы завітвалі на моркву.

Каб абабегчы сьцежкаю шэсьць вокнаў,
патрэбна босым ножкам адпачыць –
найлепей, дзе жыве мая стакротка
ў маленькай хатцы са страхой з травінак.

Яшчэ няма ні здрадаў, ні каханьняў,
І неўміручыя яшчэ бацькі,

якіх засьпеў аднойчы ў ложку зраньня
ў занятку дзіўным. Год праз дзесяць толькі

я зразумею, што паспаўшы болей
тым днём дажджлівым, мог бы атрымаць
сястрычку зноўку ці малога брата,
з якім хадзіў бы разам падзівіцца

на дзецюкоў, што брук кладуць да пляцу –
вясёлы кожны і, нібы мурын,
ад сонца чорны. Брукаванка ляжа
да храму Стэфана, які спыніўся

каменным галёнам па-над местам.
А там увішныя дзядзькі кладуць
у алтары й на хоры выбухоўку,
каб замаўчаў гадзіньнік старасьвецкі,

які зацята час лічыў па-свойму.
На Готландзе мне сьніцца Полацк мой.
Хаваюць тату, мушка на фіранцы
ў жалобе сьціхла. Я ж так нецярпліва

чакаю ўжо: ці праўда ён пазвоніць
на дзень маіх народзін, як сказаў.
Бяжыць насустрач рыжая дзяўчынка,
ляціць адтуль, адкуль не дазваніцца.

За ёю коціцца зялёны ровар –
пусты, хоць круціць нехта панажы.
“Сасі банан трапічаскага лесу”, –
злавесна цэдзіць мой сусед-аторва,

у рыжую таксама закаханы.
Ля крамы сварыцца чарга па хлеб.
Вясёлка бруку зьзяе з-пад асфальту.
А наша Дзьвінка – як Дзьвіну мы звалі –

цячэ ў сутоньні ранішнім у мора –
далей, на Готланд, проста ў сноў вітраж,
дзе дом на скалах над гатычнай кірхай,
дзе з мезаніну дэндзі мармуровы

ў капелюшы сьціхотліва знаёмым
шматзначна па-сяброўску падміргне
з таго, ня менш рэальнага сусьвету.
Там ружы на Каляды зацьвітаюць.

Там вокны – як музейныя вітрыны,
што вечар ператворыць у вяртэп
з караблікамі, дамамі, чарцямі –
жыцьця свайго павольнаю прасторай,

дзе некалі і я знайдуся, можа:
нацубіўшы зялёны капялюш,
міргну камусьці ўсьцешна з мезаніну.
У Полацку мне сьніцца востраў Готланд.

## АНДЭРСЭН І ТЫ

Андэрсэн
(той, які напісаў “Дзюймовачку”
і “Брыдкае качаня”)
быў баязьліўцам і недарэкам:
жыў у страху, што яго
спакусяць,
атруцяць,
абрабуюць.
Андэрсэн
ня мог пазбыцца жуды,
што будзе пахаваны жывым
(пры ложку нязьменна
ляжала цыдулка:
“Насамрэч я не памёр”),
што згарыць у пажары
(з сабою заўсёды была вяроўка,
каб вылезьці ў вакно),
што загіне ў марскіх хвалях
(зьвестак пра ратавальнае кола
не захавалася).
Андэрсэн
баяўся памерці ад трыхінелёзу,
адно марачы пра
залацісты кавалак сьвежаніны.
Андэрсэн
ведаў, што
боязь адкрытай прасторы
дактары называюць агорафобіяй.
Андэрсэн
вечна перайма́ўся тым, што
згубіў пашпарт,
дрэнна заклеіў канверт,
пераплаціў за білет.

Андэрсэн
усё жыцьцё пакутаваў, што
непрыгожы,
не падабаецца жанчынам,
ня ведае, што з імі рабіць.
Андэрсэн
памёр цнатлівы,
з ціхай радасьцю, што
нарэшце вызваліўся
ад болю
ў сваіх і ў штучных зубах.

Ты
добра заклейваеш канверты
(хоць у тваіх шыротах
таямніца ліставаньня
ад гэтага не залежыць).
Ты
не баішся пляцаў
(нават ачэпленых сьпецназам).
Ты
ясі сьвініну
і, вычвараючыся,
аддаеш перавагу
вушам і лычыкам.
Ты
не баішся, што цябе спакусяць.
Ты
ведаеш, што цябе пахаваюць
надзвычай надзейна
(дакладней – безнадзейна)
памерлым
і зусім не цнатлівым.

Цяпер зразумела,
чаму ты не напісаў
ні “Сьнежнае каралевы”,
ні “Новага ўбраньня караля”.

## IT’S ALL THE SAME...

*Яну Максімюку*

У паўпустым вечаровым метро
з ленаватым позехам жніўня
і рэкламаю контрацэптываў

ператвараешся ў гледача
вандроўнага тэатру на рэйках.
У сьпектаклі занятыя:
дзьве парачкі закаханых:
зусім юная і сталая
з заручальнымі пярсьцёнкамі,
відавочна падараванымі
не адно аднаму;
былы паэт, а цяпер
пітушчы ціхі вар’ят
з пляшкаю ў кішэні;
маладая мама з немаўлёнкам
і хлопец з плэерам.
Юныя закаханыя
ўзасмокт цалуюцца,
сталыя пераплятаюцца пальцамі,
былы паэт выцягвае ня пляшку,
а зашмальцаваную кніжку,
немаўлёнак шукае цыцу,
хлопец умыкае плэер.
Інтрыга залежыць
ад тваёй фантазіі:
уладальнік плэеру
пазнае ў адным з каханкаў
роднага бацьку,
былы паэт пазнае
ў спадарожніцы апазнанага бацькі
сваё першае каханьне,
ты пазнаеш песьню Бон Джові:
*It’s all the same...*
юная закаханая
пазнае ў гаспадары плэера
таго, хто ўвесну
пазбавіў яе нявіннасьці
*only the names have changed...*
немаўлёнак пазнае пакуль
толькі маміны цыцы,
якія, здаецца, не пазнае
ніводны з астатніх прысутных
улучна з табою.

*It’s all the same,*
*only the names have changed...* –
сьпявае Бон Джові.
Словы нарэшце даплываюць

да твае сьвядомасьці:
*Усё засталося па-ранейшаму,*
*толькі імёны зьмяніліся...*
Класная песьня, думаеш ты,
усьцешана ўяўляючы, як
гадоў праз семдзясят пяць
у гэтым метро зноў
будзе ехаць вечар
у кампаніі з жніўнем,
і сёньняшні немаўлёнак
(адзіны, у каго ня зьменіцца імя)
зьявіцца на сцэне ў ролі
былога паэта
(калі бываюць былыя паэты)
з пляшкаю і
зашмальцаванай кніжкаю
(калі тады яшчэ будуць кніжкі,
якія можна зашмальцаваць),
а нейкі маладзён умкне
які-небудзь тагачасны плэер,
што дзівам захавае мелодыю,
якая цяпер атручвае цябе
неадольным аптымізмам,
і ты ўжо верыш, што –
пакуль на тваім месцы ўладкуецца
хтосьці з іншым імем –
яшчэ пасьпееш стварыць
геніяльны раман,
наведаць Новую Зеландыю,
а таксама
выпіць з Міланам Кундэрам,
дасхочу нагаварыўшыся з ім
пра гэтую невыносную
лёгкасьць быцьця.

## КАЛІ-НЕБУДЗЬ УСЁ БУДЗЕ АПОШНІМ

Калі-небудзь усё будзе апошнім:
апошні ранішні кубак
неверагодна моцнай
кенійскай гарбаты з малаком,
апошнія абдымкі жанчыны
з скураю колеру гэтай гарбаты
і апошнія жаночыя абдымкі наогул,

апошняя ангіна,
апошняя жменька суніцаў
са смакам тваіх смочак,
апошняя гульня з сынам
у пінг-понг,
апошняе нецэнзурнае слова
ў тваё пяшчотнае вушка
і апошняе слова
ў вуха Вечнасьці,
апошняя напісаная кніга
і апошняя кніга, якую разгарну,
апошні наведнік маёй вальеры,
як я называю гэтак званы кабінет,
і апошні наведнік
(лепей наведніца)
майго сэрца,
апошні келіх віна,
апошняя эрэкцыя,
апошняя вандроўка
па тваёй салодкай вагіне,
апошняя вандроўка
ў родны горад
і самая апошняя вандроўка
з большай ці меншай колькасьцю
спадарожнікаў і спадарожніц
у цёмных (але неабавязкова)
гарнітурах і сукенках,
апошні электронны
ці проста ліст,
які можа прыйсьці мне
або майму адрасату,
ужо калі ўладкуюся
ў сваім апошнім
транспартным сродку,
дзе складана напісаць
або атрымаць адказ
нават праз e-mail...

Чамусьці неадчэпна думаў
пра такія рэчы,
калі яшчэ не была вынайдзеная
электронная пошта,
а цяпер
штораз з большаю асалодай згадваю,
як усё тое, што будзе апошнім,
здарылася ўпершыню.

## У ПОЛАЦКУ

Ня ведаў
да адной зімовае ночы,
што ў маім Полацку
ёсьць старадаўнія кварталы
і цэлыя вуліцы,
куды не трапляюць турысты
і нават месьцічы –
калі ня знаюцца ў адмысловых
перамеценых завірухаю сьцежках.
Ня ведаў
да адной вясновае ночы,
што мой родны завулак
з козамі і дзьмухаўцамі
выводзіць на барокавы пляц з ратушай,
якога няма ў турыстычных даведніках.
Ня ведаў
да адной летняе ночы,
што за вайсковым гарадком
разьлёгся прыцемны сад,
вартаваны совамі
і змрачнаватымі скульптурамі,
што ўпотай мяняюцца месцамі,
зацята адводзячы позіркі.
Ня ведаў
да адной восеньскае ночы,
што за Дзьвіною ёсьць
аточанае ніцымі вербамі возера,
якое ня знойдзеш,
пайшоўшы цераз мост –
адно тады, калі цябе
пераправіць на чаўне
негаваркі перавозьнік
з акулярыстай вужакаю на карме.
Ня ведаў
да ўчарашняе ночы,
што каля ратушы
адчынілі кавярню,
дзе можна пакаштаваць
адвечных полацкіх страваў –
ад халоднае бульбы
з брусьніцавым сочывам
да гарачых сырных пальчыкаў,
што апякаюць паднябеньне.

Цяпер ведаю і
чакаю ліста ад жанчыны,
з якой пазнаёміўся ўчора
ў кавярні,
пешчу на вуснах
яе вішнёвы пацалунак,
хаджу да вечара
з апечаным паднябеньнем.

## ЧАМУ ТЫ НЕ ПАЗВАНІЎ МАМЕ?

У начным аўтобусе
паміж Менскам і Вільняй,
на небясьпечнай мяжы
явы й сну,
які любіць глядзецца
ў люстэрка, дзе –
сьцьвярджаў Авідзі –
хаваецца сьмерць,
мне прымроіўся тэлефон,
з якога можна пазваніць
тым, хто ўжо не пазвоніць табе.
Званкоў толькі тры,
і ты
мусіш зрабіць
імгненны выбар.

У таты я запытаўся
пра незнаёмую заплаканую жанчыну,
якую сустрэў у шпіталі
пры ягоным ложку,
калі ў таты заставаліся жывыя
адны толькі вочы.

У Купалы я запытаўся
пра жанчыну, якая сьмяялася
ў ягоным нумары
ў той вечар, калі яго забівалі
ў маскоўскім гатэлі.

У Борхеса я запытаўся
пра жанчынаў,
якія дзялілі з ім
ягоную бясконцую цемру.

Памежнік запытаўся пашпарт,
якраз калі я

прасіў дзявочы голас у слухаўцы
злучыць мяне
з Станіславам Аўгустам Панятоўскім,
каб запытацца пра
каранаваную жанчыну,
якая ператварыла ягоны трон
ува ўнітаз,
і дзявочы голас адказаў,
што я вычарпаў
колькасьць званкоў.

Забіраючы пашпарт,
я сьцяўся ад думкі,
што ўбачу там штамп:
ЧАМУ ТЫ НЕ ПАЗВАНІЎ
МАМЕ?

**ВЯЛІКАДНЕ**

Перад Вялікаднем
мама пякла
салодкіх птушачак
з вясёлымі вочкамі-разынкамі.
Я выкалупваў вочкі
з цёплых булачак,
потым плакаў,
што мае птушачкі – сьляпыя,
а пасьля
старанна еў гаротніц.
Мама казала, што
птушачкам вельмі балюча,
але, калі ты іх зьясі,
знойдуць яны свае вочкі
і – уваскрэснуць!
*Мама, а што такое ўваскрэснуць?*
*А яны, сынок, ажывуць*
*і паляцяць да Божачкі.*

Яшчэ зараз памятаю,
як шчасьліва засынаў
узброены недзіцячай ведаю:
уваскрэсьне той,
каму напачатку
выкалупаюць вочкі.

## У БУКІНІСТА

Калі кнігі даведваюцца,
што трапяць у букіністычную краму,
яны паводзяцца па-рознаму:
адны роспачна точацца ў другі шэраг,
другія вытыркаюць забытыя закладкі,
каб паказаць, што яшчэ патрэбныя,
трэція знаходзяць для цябе
паміж забытых старонак
інтымны ліст
ці прыхаваную купюру.
Толькі кнігі,
якія напісаў ты сам,
ганарліва касавурачыся
на тамы нобелеўскіх лаўрэатаў
пачатку мінулага стагоддзя
і нават на трохвекавыя рарытэты,
а таксама адна на адну,
чуюцца ў бясьпецы.
Ім здаецца,
што пакуль ты жывы,
іхні гаспадар ня зьменіцца,
а можа, і пазьней
не давядзецца мяняць
утульнага месца
на пыльнай палічцы за фотаздымкамі,
бо гаспадар
добра выхоўваў нашчадкаў.
Наіўныя! Сёньня
томікі з гэтай паліцы
я занясу знаёмаму букіністу –
каб зьбіць з іх фанабэрыю,
каб паназіраць,
як яны будуць пачувацца
ў кампаніі з сваімі блізьнятамі,
што ўжо здадзеныя ў краму
маімі сябрамі, якім некалі
напісаў на тытуле
колькі прачулых словаў.
Каб *мае* кнігі
былі ў роўных умовах,
на разьвітаньне я таксама
пакіну на іх аўтографы –
самому сабе.